✓**8 верасня** ў выставачным комплексе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрыўся выставачны праект **«Бібліяі-КОМПАС. Навігатар па падарунках бібліятэцы»**, дзе візуальны прадметны і дакументальны шэраг аб'яднаны вобразам бібліятэкі. Увазе наведвальнікаў прадстаўлены шматлікія падарункі партнёраў, гасцей, сяброў і чытачоў бібліятэкі: жывапісныя палотны, калажныя работы, акварэльныя замалёўкі і фотапластыка; цікавыя нацыянальныя сувеніры і прадметы адзення; кнігі з аўтографамі пісьменнікаў, даследчыкаў, вучоных і мастакоў, факсімільныя ўзнаўленні кніжных помнікаў, альбомныя выданні ад прыватных асоб і замежных дэлегацый з краін Еўропы, Азіі і Афрыкі. Асобнае месца ў экспазіцыі займаюць узнагароды, атрыманыя бібліятэкай за паспяховую працу ў ажыццяўленні выдавецкіх праектаў па захаванні і папулярызацыі кніжнай спадчыны, за актыўную дзейнасць у сферы міжнароднага гуманітарнага супрацоўніцтва.

Выставачны праект будзе працаваць да 30 лістапада.